УДК 394.268.3:316.7(476)

**М. А. Пратасеня,**
*магістрант кафедры культуралогіі*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ АБРАДУ «ДЗЯДЫ» Ў СМІ ЯК ЧАСТКА ШТОДЗЁННАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

Традыцыі, абрады і звычаі займалі важнае месца ў жыцці кожнага беларуса, рабілі яе больш асэнсаванай, набліжалі да продкаў і дазвалялі адчуваць сябе часткай свайго роду. Але чаму ў апошнія гады шмат старадаўніх абрадаў паступова знікаюць? Як на гэта ўплываюць сучасныя СМІ? Як трансфармаваўся абрад «Дзяды» на працягу гісторыі? І, галоўнае, як зрабіць так, каб беларускія традыцыі не знікалі, а працягвалі жыць, хай і ў іншых формах? Задача не самая простая, але магчымая: існуе шмат пазітыўных прыкладаў у іншых культурах і краінах. І ўсё залежыць менавіта ад людзей – іх жадання, упэўненасці ў неабходнасці адраджэння гістарычнай спадчыны сваёй краіны і цікавасці да мінуўшчыны.

**Ключавыя словы:** абрад Дзяды, Дзяды ў СМІ, традыцыі Беларусі, культура Беларусі і СМІ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**M. A. Pratasenya,**
*Master student of the Department of Cultural Studies*
*of the Educational Institution “Belarusian State University*
*of Culture and Arts”, Minsk*

# REPRESENTATION OF THE «DZYADY» RITE IN THE MEDIA AS PART OF THE EVERYDAY CULTURE OF BELARUS

Traditions, rituals and customs occupied an important place in the life of every Belarusian, made it more meaningful, brought them closer to their ancestors and made them feel part of their kin. But why have many ancient rituals been gradually disappearing in recent years? How do modern media influence this process? How

has the «Dzyady» rite been transformed throughout history? And most importantly, how to make sure that Belarusian traditions do not disappear, but continue to live, albeit in other forms? The task is not the easiest one, but not impossible, as there are many positive examples in other cultures and countries. And everything depends on the people – their desire, the confidence in the need to revive the historical heritage of their country and interest in the past.

**Key words:** the Dziady rite, Dziady in the media, traditions of Belarus, culture of Belarus and the media.

Вядома, што сённяшні абрад «Дзяды» даволі моцна адрозніваецца ад таго, які існаваў раней. У сучасных людзей іншы погляд на сусвет і жыццё, таму шмат сімвалічных дзеянняў былі страчаны ў розныя гістарычныя эпохі. Акрамя таго, ужо далёка не кожны жыве ў сялянскай хаце, таму некаторыя цікавыя асаблівасці абраду, звязаныя з вясковым жыццём, таксама знаходзяцца пад пагрозай знікнення.

Паколькі першым перыядычным выданнем на тэрыторыі Беларусі стаў «Часопіс Гродзенска», які друкаваўся з 1776 г. па 1780 г., прапаную пачаць аналіз перыядычнага друку наконт пошуку інфармацыі аб узгадванні беларускіх традыцый менавіта з канца XVIII ст.

Зразумела, што ў тыя часы вельмі нязначная колькасць людзей умела чытаць, таму гаварыць аб моцным уплыве на насельніцтва з боку часопісаў не прыходзіцца. А вось пачатак XIX ст. ужо прадстаўляе для нас цікавасць: у гэты час друкуюць часопісы «Літоўскі веснік», «Губернскія ведамасці», «Епархіяльныя ведамасці», «Веснік Заходняй Расіі» і «Кур’ер Літоўскі» [3]. Амаль што ўсе вышэйназваныя выданні належалі расійскаму афіцыйнаму друку, таму гаварыць аб іх аб’ектыўнасці і жаданні захаваць беларускую культуру не прыходзіцца. Яны разглядалі тэрыторыю Беларусі як заходнюю частку Расійскай імперыі, таму і апісанне ўсіх сапраўдных беларускіх традыцый і абрадаў зводзілася да іх трактоўкі як часткі культуры Расіі.

У пачатку XX ст. з’явіліся першыя беларускамоўныя часопісы, і гэта стала новай кропкай адліку беларускай гісторыі. Так, часопіс «Наша ніва» даў назву цэламу этапу беларускага нацыянальнага адраджэння – гісторыкі называюць яго «наша-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніўскім». У часопісе друкавалі матэрыялы па гісторыі, фальклоры, гаварылі аб моўных праблемах, публікавалі звесткі аб бюджэце сялян і рамеснікаў, пісалі аб жыцці беларускіх эмігрантаў у ЗША. Асобныя старонкі былі прысвечаны гумару і анекдотам [4].

Гэты перыяд таксама характарызуецца вялікай колькасцю выданняў, якія арыентаваліся на мясцовага чытача: «Мінскі голас», «Мінскае рэха», «Мінскі лятучы лісток». Акрамя таго, з'явіліся выданні і ў невялікіх мястэчках: друкаваліся «Лідскае слова», «Бабруйскае жыццё» і г. д. Паколькі ў пачатку XX ст. чытаць маглі каля 20% насельніцтва, а друк быў даволі распаўсюджаны, мы можам гаварыць аб тым, што гэта быў той час, калі СМІ пачыналі ўплываць на думкі і пачуцці людзей. Зразумела, што ўплыў быў яшчэ не такім моцным як сёння, але беларусы ўжо называлі сабе нацыяй, таму і цікавасць да сваіх традыцыйных свят і абрадаў была сапраўды моцнай. Канешне, нельга гаварыць аб тым, што людзі даведваліся аб беларускіх традыцыях з часопісаў – яны ведалі іх ад сваіх бацькоў, але перыядычны друк падтрымліваў нацыянальны рух і падахвочваў захоўваць і памнажаць артэфакты духоўнай культуры, чаго так не хапае сёння.

Падчас СССР былі забароненыя ўсе святы акрамя «савецкіх», накшталт 1 мая, дня Кастрычніцкай рэвалюцыі, дня абаронцы Айчыны, 8 сакавіка і Новага года. За святкаванне любых іншых свят, як народных, так і рэлігійных, пагражала, у розныя гады, ад звальнення з працы да расстрэлу.

Паветра свабоды савецкія людзі адчулі толькі ў 80-я гг., і пачалі шукаць сваю сапраўдную ідэнтычнасць, што выявілася, у тым ліку, у святкаванні старажытных язычніцкіх беларускіх абрадаў. Паваротным момантам стаў 1987 г., калі «Дзяды» сталі часткай беларускага нацыянальнага руху. Менавіта ў 1987 г. сярод беларускай інтэлігенцыі пачалі з'яўляцца чуткі аб тым, што ў адну ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 г. НКУС у падвалах унутранай турмы ў Мінску расстралялі 139 чалавек беларускіх пісьменнікаў, паэтаў і іншых дзеячаў культуры і навукі. Сімвалічна, што «Ноч расстраляных паэтаў» амаль што супадае па часе з Днём памяці памерлых продкаў. Якраз праз 50 гадоў пасля той крывавай і трагічнай ночы «Дзяды» 1987 г. сталі першым сімвалам нязгоды новага пакалення беларусаў з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

палітыкай савецкай улады. «Чуткі» сталі вядомыя шырокаму колу насельніцтва праз год: улетку 1988 г. у папулярнай газеце «Літаратура і мастацтва» быў апублікаваны артыкул аўтарства Яўгена Шмыгалёва і Зянона Пазняка пад назвай «Курапаты: дарога смерці». У артыкуле аўтары распавядалі пра масавыя пахаванні ў лесапаласе ўрочышча Курапаты на паўночна-ўсходняй мяжы Мінска [6].

У пачатку 90-х гг. «Дзяды» канчаткова сфарміраваліся як агульнанародны Дзень памяці ахвяр савецкіх рэпрэсій. У пачатку лістапада штогод некалькі тысяч чалавек прымалі ўдзел у шэсці на Курапаты, мерапрыемствы сталі праводзіцца таксама ў Лошыцкім парку, дзе таксама ёсць масавыя пахаванні рэпрэсіраваных. У 90-х гг. склалася традыцыя правядзення курапацкіх сустрэч, калі беларусы пачалі добраахвотна прыходзіць прыбіраць смецце і прыводзіць у парадак урочышча, а таксама з'явілася новая традыцыя: штогод ставіць драўляныя і металічныя крыжы ў памяць аб нявінных ахвярах сталінскіх рэпрэсій.

Сёння ж амаль што ўсю інфармацыю людзі чэрпаюць з Інтэрнэту. Існуе даволі шмат сайтаў і тэматычных аб'яднанняў, у якіх кожны жадаючы можа даведацца аб тым, як святкуюць «Дзяды». Традыцыйна некалькі вялікіх інфармацыйных парталаў Беларусі робяць аглядныя артыкулы з выявамі могілак Беларусі і пішуць, ці шмат людзей прыходзіць да сваіх продкаў. Паколькі самы вялікі некропаль краіны знаходзіцца ў Гродне, яму прысвечана шмат артыкулаў напярэдадні 2 лістапада. Акрамя таго, на папулярных інтэрнэт-парталах часам публікуюць народныя прымаўкі і прыкметы, якія звязаны з рознымі беларускімі святамі. Такую ж тэндэнцыю можна пабачыць і на сучасным тэлебачанні – абавязкова перад прагнозам надвор'я дыктар згадвае, якім быў гэты дзень у календары нашых продкаў, якія адзначалі тое ці іншае свята.

Яшчэ адна група сайтаў, якія актыўна пішуць пра «Дзяды» – эзатэрычныя, прысвечаныя славянскай і кельцкай міфалогіі. Дарэчы, менавіта на такіх сайтах прасцей за ўсё знайсці дэталёвыя асаблівасці правядзення абраду, пра якія часта забываюцца сказаць на вялікіх навінавых парталах. Трэба адзначыць, што падыход да вывучэння свят і абрадаў на тэматычных сайтах больш глыбокі і падрабязны, таму пасля знаёмства з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

усёй інфармацыяй, апублікаванай на старонцы, можна даволі ярка ўявіць, як жылі нашыя продкі.

Апошні тып сайтаў, на якім часта можна знайсці інфармацыю аб «Дзядах» – этнаграфічныя старонкі. Гэта вельмі цікавая катэгорыя, таму што менавіта на такіх сайтах публікуюць рэдкія копіі кніг і не самыя распаўсюджаныя артыкулы. Таксама ёсць шмат лекцый ад вядомых гісторыкаў і этнографаў па неабходнай тэме. Адна з цікавых асаблівасцей – аўдыязапісы радыёэфіраў з выступленнямі навукоўцаў. Асабліва распаўсюджаны такі фармат абмену інфармацыяй на польскіх сайтах. Так, на Polskie Radio змешчана шмат тэматычных аўдыязапісаў эфіраў розных гадоў, з якіх, напрыклад, можна даведацца аб святкаванні «Дзядоў» у традыцыях розных народаў.

Такім чынам, існуе шмат фарматаў перадачы інфармацыі, і нават праз часопісы ды Інтэрнэт можна паказаць адны і тыя ж падзеі вельмі па-рознаму, чым і займаюцца асабліва актыўна сучасныя СМІ. Дзякуючы таму, што ў нас ёсць магчымасць наведваць розныя сайты і чытаць розныя часопісы, мы, прааналізаваўшы пэўны пласт інфармацыі, можам даволі дакладна ўявіць, якімі былі «Дзяды» ў розныя эпохі, як людзі ставіліся да правядзення гэтага абраду і чаму праз стагоддзі гэты дзень набыў палітычны акрас. Усе гэтыя трансфармацыі, у той ці іншай меры – паступовая праца СМІ.

Але што такое «Дзяды?» Які вобраз гэтага дня мы маем сёння? Гэта навуковы рытуал, цікавая гістарычная практыка, палітычная акцыя, а, мабыць, проста мастацкая прыдумка? Кожная крыніца інфармацыі мае свой погляд на гэты дзень.

Першапачаткова «Дзяды» – гэта паганская традыцыя, якую з часам некаторыя слаі насельніцтва пачалі ўспрымаць як рэлігійную практыку. Але ці сталі «Дзяды» сапраўды толькі рэлігійным святам? Наўрад ці: канечне, ёсць шмат людзей, якія ідуць у царкву, моляцца, гатуюць толькі посныя стравы.

Але гэта толькі частка насельніцтва: другая палова не бачыць цеснай узаемасувязі з рэлігіяй, і проста прыходзіць у гэты дзень на могілкі, ці запрашае памерлых сваякоў дахаты з дапамогай спецыяльных рытуалаў. Але болей за ўсё тых людзей, якія «змешваюць» традыцыі і не адмаўляюцца ні ад яе паганскіх каранёў, ні цалкам выконваюць усе запаветы царквы.

А што далей? Далей на развіццё «Дзядоў» пачала аказваць уплыў мастацкая прыдумка. У XIX–XX стст. сярод інтэлі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

генцыі было даволі шмат людзей, якія пачалі актыўна цікавіцца краязнаўствам, і сярод іх – Адам Міцкевіч і Янка Купала. Зразумела, што яны даволі добра ведалі гэты абрад, але ў іх творах сустракаюцца і зусім нерэалістычныя моманты, якія можна тлумачыць толькі як мастацкую прыдумку. Ці аказала гэта ўплыў на развіццё абраду? Безумоўна, так! Сёння, чытаючы творы, сучаснаму беларусу вельмі цяжка сказаць, ці было ўсё тое сапраўды, што апісваюць аўтары. І адкуль мы можам даведацца розніцу паміж святкаваннем «Дзядоў» да і пасля напісання гэтых твораў? Вядома, што яны ўсё ж такі даволі моцна паўплывалі на традыцыі ў некаторых рэгіёнах Беларусі ці Польшчы, але прывесці дакладныя прыклады будзе даволі складана. Можна сказаць, што ўсё гэта адбывалася толькі на ўзроўні падсвядомасці, і самі людзі часам не разумелі, што яны пераналі, а што было раней.

І апошняе – палітычная акцыя. Тут прасцей, таму што мы ведаем дакладны год узнікнення гэтай тэндэнцыі: 1987. І трэба сказаць, што, нягледзячы на забарону з боку ўрада святкаваць гэты дзень, людзі актыўна працягваюць гэтую традыцыю і кожны год ідуць на Курапаты. Але ці можна лічыць гэта «Дзядамі?» Здаецца не, таму што галоўная мэта «Дзядоў» – гэта захаванне памяці аб сваіх продках, а не беларускай інтэлігенцыі, якая не мае дачынення да сям'і і роду кожнага беларуса. Такім чынам, мы можам пабачыць, што з-за ўплыву палітыкі «Дзяды» паступова становяцца не сямейным святам, а народным – людзі сустракаюцца разам на мірнай дэманстрацыі.

Добра гэта ці дрэнна? Немагчыма сказаць, але тое, што гэтая традыцыя актыўна трансфармуецца, мы можам пабачыць, і, зразумела, адбываецца гэта не без дапамогі з боку СМІ. Карэнны пералом у канцы 80-х зрабілі менавіта часопісы і тэлебачанне. Але якая была іх мэта? Даць людзям магчымасць даведацца праўду? Магчыма, але не толькі. Зразумела, што канец 80-х – пачатак 90-х гг. быў часам барацьбы за новы свет, новае жыццё, новыя формы ўлады, таму менавіта палітычная акцыя магла б узрушыць насельніцтва.

Але вернемся да сучаснасці. Якія тэндэнцыі прыкметны сёння? Па-першае, па тэлебачанні актыўна прапагандуецца пункт гледжання праваслаўнай царквы на гэты абрад –

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насельніцтва актыўна заклікаюць адмовіцца ад дзіўных, на іх думку, абрадаў і прыйсці ў гэты дзень у царкву. Тое ж адбываецца і з Радаўніцай: журналісты рэгулярна нагадваюць аб тым, што нельга несці ежу на могілкі і пакідаць там пасхальныя кулічы – яскравыя праявы паганства.

Так, клірык Спаса-Праабражэнскага кафедральнага сабора Магілёва, настаяцель храма ў аграгарадку Межысеткі іерэй Віктар Нікішаў гаворыць аб тым, што могілкі – не месца для ежы, таму што ўжываючы яе там, мы зневажаем памяць памерлых. Не трэба і ставіць чаркі з віном або класці цукеркі на магілу – гэта паганскі звычай [2].

Але ці магчыма зламаць традыцыі, якія складаліся стагоддзямі? І чаму некаторыя людзі ўсё ж такі пачалі хадзіць у царкву? Здаецца, што адбываюцца гэтыя перамены менавіта з-за ўплыву СМІ. Сёння нават у аддаленых вёсках абрады перажываюць трансфармацыю, людзі не могуць патлумачыць, калі яны пачалі рабіць тыя ці іншыя рэчы. Тады ці магчыма казаць, што гэта сапраўды аўтэнтычны, старадаўні абрад, веды аб якім пераходзяць ад аднаго пакалення да другога? Здаецца, не. Уплыў СМІ можа абмінуць толькі тыя традыцыі, якія захаваліся ў пэўных рэгіёнах і з'яўляюцца малавядомымі – у гэтым выпадку СМІ проста не будуць цікавіцца імі.

Напрыклад, гэта актуальна для некаторых рэгіёнаў Палесся – людзі ў аддаленых вёсках да пачатку XX ст. жылі ізалявана, амаль што не кантактавалі нават са сваімі суседзямі, таму менавіта Палессе сёння з'яўляецца адным з найбольш цікавых і культурна багатых рэгіёнаў для сучасных этнографаў, гісторыкаў, фалькларыстаў [5].

У 1980–1990-я гг., калі ўздымалася пытанне пра аўтаномію Палесся, ішло стварэнне літаратурнай палескай мовы – на ёй нават выдаваліся ўкладышы для часопісаў. Але з тых часоў, як маладыя палешукі сталі актыўна перабірацца ў вялікія гарады, носьбітаў дыялекту застаецца ўсё менш. Каб захаваць родны гоман, некаторыя палешукі гатовыя на подзвігі. Так, навуковец Фёдар Клімчук 15 гадоў выдаткаваў на тое, каб перавесці на мову роднай вёскі Сіманавічы Біблію. А В. Дунін-Марцінкевіч нават напісаў «Пінскую шляхту» не толькі на беларускай мове, але асобна і на палескім дыялекце. Сёння ў тэатры Пінска ставяць абодва варыянты [7].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тое ж датычыцца і святкавання «Дзядоў». Менавіта на Палессі захавалася найбольшая частка цікавых, незвычайных, вельмі рэдкіх для Беларусі традыцый. Нават стравы ў гэтай мясцовасці іншыя: заўсёды аддаецца перавага не мясу, а рыбе [1].

Ці дайшлі б усе гэтыя цікавыя адметнасці да сённяшняга часу, калі б Палессе не знаходзілася пасярод балот і рэк і не было абасоблена ад астатняй часткі Беларусі? Вядома, не. Таму што калі гэта распаўсюджаная традыцыя, характэрная для вялікай тэрыторыі, пазбегнуць трансфармацый амаль што немагчыма.

Калі гаварыць пра сучасныя апазіцыйныя СМІ, то, зразумела, іх галоўнай мэтай з'яўляецца барацьба за думкі простых людзей, і яны ствараюць вобраз «Дзядоў» як народнага свята за барацьбу і незалежнасць беларусаў. У некаторай часткі насельніцтва гэта таксама мае поспех, але тут трэба гаварыць аб хвалепадобных тэндэнцыях: у палітычна цяжкія гады колькасць удзельнікаў акцыі адразу ўзрастае, а вось у даволі спакойны час прыхільнікаў у гэтай традыцыі значна менш.

У апошнія гады, з-за ўсё тых жа палітычных спрэчак, вельмі відавочным становіцца і трэці бок: людзі жадаюць глыбей пазнаць сваю культуру, уз'яднацца са сваімі продкамі, стаць сапраўднай духоўнай часткай беларускага народа. У выніку колькасць тых, хто менш грандыёзна, чым іх продкі, але самааддана і шчыра святкуе «Дзяды», узрастае. Пакуль гэта не так бачна, але, як вядома, у любыя цяжкія часы, якія закранаюць дзяржаву, людзі імкнуцца глыбей дакрануцца да сваіх каранёў.

Напрыклад, шмат актыўных беларусаў ствараюць старонкі ў сацыяльных сетках, дзе расказваюць пра беларускія міфы, традыцыі і гісторыі сваіх продкаў. Існуе шмат краязнаўчых форумаў і аб'яднанняў, на якіх людзі актыўна дзеляцца той інфармацыяй, якую ім пашчасціла знайсці ў архівах ці падчас навуковых экспедыцый. Вельмі добра, што сёння простыя беларусы бяруць на сябе некаторыя з задач СМІ і «капаюць» значна глыбей, чым гэта робяць часопісы ці журналы. Распаўсюджваецца мода на традыцыйнае адзенне: усё больш беларускіх дызайнераў ствараюць калекцыі з традыцыйнымі элементамі, выкарыстоўваюць арнамент і традыцыйныя беларускія сімвалы ў сваіх вырабах. Усё гэта гаворыць аб тым, што ў людзей ёсць цікавасць да сваіх традыцый, продкаў і гісторыі, і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

значную колькасць беларусаў нельга аднесці да тых, хто не цікавіцца сваёй культурай.

А што далей? Далей усё залежыць ад сумленнасці СМІ, таму што, на жаль, немагчыма ігнараваць усё тое, што гавораць кожны дзень па тэлебачанні і пішуць у часопісах. Калі на экранах тэлевізараў з'явяцца сапраўдныя, апантаныя дзеячы беларускай культуры, гэта стане часам адраджэння Беларусі, нашай беларускай традыцыйнай культуры, значным момантам, калі мы зможам прадэманстраваць усім іншым краінам, што з'яўляемся моцнай нацыяй з багатай гісторыяй і неверагоднай культурай.

Але нельга забывацца і пра сябе, сваю сям'ю, сваіх сяброў. Калі кожны будзе працаваць і даносіць да сваіх знаёмых не толькі значнасць абраду «Дзяды», но і іншых свят і традыцый у жыцці і гісторыі беларусаў, здаецца, усё больш і больш людзей будуць гэты дзень праводзіць у думках аб сваіх памерлых сваяках, іх жыцці і ўдзячнасці за тое, што яны калісьці жылі на гэтым свеце.

Такім чынам, усё тое, што адбываецца з беларускай культурай яшчэ магчыма змяніць. Галоўнае ў гэтым пытанні – жаданне быць часткай беларускай культуры, яе носьбітам, яе прадстаўніком у свеце. Калі кожны беларус будзе адчуваць гэтую сувязь са сваімі каранямі і гісторыяй сваёй краіны, пытанне аб знікненні традыцыйных абрадаў ці свят перастане быць такім вострым і балючым.

1. *Барило, Ю.* Бескрайние болота и другой язык: в чем уникальность Белорусского Полесья? [Электронный ресурс] / Ю. Барило // Планета Беларусь. – Режим доступа: https://planetabelarus.by/publications/beskraynie-bolota-i-drugoy-yazyk-v-chem-unikalnost-belorusskogo-polesya. – Дата доступа: 13.05.2022.

2. *Николаева, Е.* Как провести Радоницу по-христиански? [Электронный ресурс] / Е. Николаева // Вечерний Бобруйск. – Режим доступа: https://bobruisk.ru/news/2022/04/30/kak-provesti-radonicu-po-hristianski-otvechaet-svyashennik. – Дата доступа: 11.05.2022.

3. Полнотекстовая коллекция «Перыядычны друк Беларусі да 1945 года» [Электронный ресурс] // Президентская библиотека Республики Беларусь. – Режим доступа: https://preslib.org.by/polnotekstovaya-kollekciya-peryyadychny-druk-belarusi-da-1945-goda. – Дата доступа: 09.05.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Санько, З.* Факсімільнае выданне першай масавай беларускай дэмакратычнай газеты «Наша Ніва» [Электронны рэсурс] / З. Санько // Беларуская палічка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/none/Nasa_Niva_zip.html. – Дата доступу: 09.05.2022.
5. *Толстая, С. М.* Деды в полесском народном календаре. Балто-славянские этнокультурные и археологические древности. Погребальный обряд / С. М. Толстая. – М. : Ин-т славяноведения и балканистики РАН, 1985. – 81 с.
6. *Шмыгалёў, Я.* Курапаты: дарога смерці / Я. Шмыгалёў, З. С. Пазняк // Літаратура і мастацтва. – 1987. – № 11.
7. *Щирый, Т.* Старое Палессе, якога вы не бачылі [Электронный ресурс] / Т. Щирый // Onliner. – Режим доступа: https://people.onliner.by/2021/12/09/staroe-palesse-yakoga-vy-ne-bachyli. – Дата доступа: 09.05.2022.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

УДК 94(368):(316.7+572)

**Ю. С. Барадзін,**
*аспірант кафедры культуралогіі*
*ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», Мінск*

# КУЛЬТУРА ВІКІНГАЎ ЯК ПРАДМЕТ ВІЗУАЛЬНАЙ АНТРАПАЛОГІІ

Паказаць ролю традыцыйнай культуры вікінгаў у візуальнай культуры і ў кантэксце яе адраджэння і вяртання ў сучасную культуру. Аб'ектам даследавання з'яўляюцца вікінгі ў візуальнай антрапалогіі. У публікацыі аўтар звяртаецца да навуковай і мастацкай літаратуры, да інтэрнэт-спасылак пра вікінгаў у візуальнай антрапалогіі, у якой вікінгі працягваюць адыгрываць ролю ў фотаздымку, кіно, рэкламе, мастацтве. Дадзенае даследаванне можа выступаць асновай для правядзення далейшых даследаванняў.

**Ключавыя словы:** вікінгі, візуальнае, антрапалогія, мастацтва, культура, богі, героі, персанажы.